# <u>ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ</u>

| № | Гісторыка-культурная каштоўнасць | Катэ-горыя | Адрас |
|---|---|---|---|
| 1 |  **Курган перыяду ранняга сярэднявечча XII ст.**<br><br>Курган знаходзіцца за 0,5 – 0,7 км. на захад ад гарадзішча, каля дарогі ў в. Зарэчча. Дыяметрам 20 м., вышынёй 1,5 м. Выявіў і абследваў у 1981 годзе Э.М. Зайкоўскі. Раскопкі не праводзіліся. | **3** | в. Бортнікі-1, каля дарогі ў в. Зарэчча |
| 2 |  **Курганны могільнік перыяду ранняга сярэднявечча (IX-XIII стагоддзі).**<br><br>Курганны магільнік 0,5 км на захад ад паўночнай ускраіны вескі, на вясковых могілках, на правым беразе р. Ула. Адкрыў і абследваў у 1972 г. М.М, Чарняўскі, у 1981 г. абследваў Э.М. Зайкоўскі. Раскопкі не праводзіліся. | **3** | в. Жарна-секава, 0,8 км на паўноч-ны захад ад вёскі |
| 3 | **Курган перыяду ранняга сярэднявечча (XII стагоддзе).**<br> Курганны могільнік знаходзіцца за 0,1 км. на паўночны захад ад вёскі, 2 насыпы, дыяметрам 10 м., вышынёй 1,5 м. Выявіў і абследаваў у 1981 годзе Э.М. Зайкоўскі. Раскопкі не праводзіліся. | **3** | в. Зарэчча, 0,1 км на захад ад вёскі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4 | **Курган перыяду ранняга сярэднявечча (XIII стагоддзе).**<br><br><br>Мясцовая назва Валатоўка. За 0,5 км. на паўночны ўсход ад вескі. На левым беразе р. Ула. Дыяметр 24 м., вышыня 3,5м. Выявіў у 1956 г. Л.В. Аляксееў, абследавалі ў 1972 г. М.М. Чарняўскі, у 1981 г. Э.М. Зайкоўскі. | **3** | в. Прыгожае, 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі |
| 5 | **Курганны магільнік перыяду ранняга сярэднявечча (X-XIII стагоддзі).**<br><br>Знаходзіцца за 0,25 км. на захад ад вескі. 3 насыпы вышыней 1-1,5 м., дыяметрам 11-15 м. выявіў у 1955 г. Л.В. Аляксееў, абследваў у 1972 г. М.М. Чарняўскі. Раскопкі не праводзіліся. | **3** | в. Узрэчча , 0,25 км на захад ад вёскі |
| 6 | **Курганны могільнік перыяду ранняга сярэднявечча (X-XIII стагоддзі).**<br><br><br>Курганны могільнік знаходзіцца за 2,5 км. на паўднёвы захад ад вёскі, у лесе, каля дарогі. Выявіў у 1929 г. I. Карандзей, абследваў ў 1972 годзе М.М. Чарняўскі. Раскопкі не праводзіліся. | **3** | в. Ульянаўка, 2,5 км на паўднёвы захад ад вёскі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 7 | **Курган перыяду ранняга сярэднявечча (XII стагоддзе)**<br>Курган знаходзіцца за 0,5 км. на паўднёвы захад ад вёскі, у лесе. 4 насыпы вышынёй 1,8 м., дыяметрам – 12 м. Адзін курган падоўжаны памерам 31х12х2 м. Адкрыў і абследваў у 1956 гаду Л.В. Аляксееў. У 1981 г. абследваў Э.М. Зайкоўскі. Раскопкі не праводзіліся. | **3** | в. Фролкавічы, 2,5 км на паўночны захад ад моста праз р. Ула |
| 8 | **Гарадзішча жалезнага веку ( V стагоддзе да н. э. – V стагоддзе н. э.)**<br><br>Знаходзіцца за 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі. Пляцоўка памерам 68х48 м. выцягнута з поўдня на поўнач і ўзвышаецца над падножжам на 7-10м. З паўночнага боку – роў глыбінеей 2 м. і 2 валы вышынёй 2,1-2,5 м. Цяпер на пляцоўцы могілкі. Вядома з 1964 г., абследавалі ў 1972 г. М.М. Чарняўскі, у 1981 г. Э.М. Зайкоўскі. Раскопкі не праводзіліся. | **3** | в. Чарнагосце, 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі |
| 9 | **Гарадзішча жалезнага веку ( V стагоддзе да н. э. – V стагоддзе н. э.)**<br> | **3** | в. Янаўшчына, 0,5 км на поўнач ад вёскі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 10 | **Стаянкі Асавец -2,3,4,5,6,7**<br><br>**Крывінскі тарфянік** – месца цэлага шэрагу старажытных паселішчаў узростам да 6 тыс. гадоў. На яго тэраторыі знаходзяцца помнікі археалогіі – стаянкі Асавец 2,3,4,5,6,7. Большасць з іх даследаваў у 1968 г. М.М. Чарняўскі. На паверхні ўзгорка трапляліся крамяневыя прылады працы і кераміка, а ў торфе каля паўночна- ўсходняга падножжа – рэшткі драўляных збудаванняў. Археалагічныя раскопкі вядуцца і зараз пад кіраўніцтвам Максіма Міхайлавіча Чарняўскага. | **3** | в. Асавец |
| 11 | **Камень-следавік і крыніца, якая ўшаноўваецца**<br><br>Знаходзіцца ў 0,8 км на ўсход ад вескі. На левым беразе невялікай безыменнай рачулкі, якая ўпадае ў воз. Астроўна, ва ўрочышчы Божы Слядок. Злева ад дарогі ў в. Жыгалы. | **3** | аг. Астроўна |
| 12. | **Гарадзішча жалезнага веку, VII ст. да н.э. – IV ст. н.э.**<br><br>Гарадзішча знаходзіца за 0,4 км на ўсход ад вёскі, на левым беразе р. Бярозкі. Пляцоўка дыяметрам 38 м. Паўночны схіл стромкі, з поўдня прасочваюцца рэшткі рова, з усходу схілы разараны. Помнік археалогіі абседвалі ў 1956-57 гадах Л. В. Аляксееў, у 1972 годзе М. М. Чарняўскі, у 1981 г. Э. М. Зайкоўскі. Знойдзены рэшткі ляпной керамікі днепра-дзвінскай культуры (8-7 стагоддзі да н. э.). | **3** | в. Рубеж Верхнякрывінскі сельскі Савет |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 13. | **Гарадзішча жалезнага веку, V стагоддзе да н.э. – V стагоддзе н.э.**  Гарадзішча знаходзіцца за 1 км на ўсход ад вёскі Застарынне. Пляцоўка амаль круглай формы, памерам 40х41 м, узвышаецца над наваколлем на 9 метраў. Валы і равы адсутнічаюць. Помнік археалогіі выявіў і абследаваў у 1959 г. Л.В. Аляксееў, у 1981 г. – абследаваў Э.М. Зайкоўскі. У культурным пласце каля 1 м знойдзены фрагменты грубаляпной гладкасценнай керамікі жалезнага веку і косці жывёл. | **3** | в. Застарынне Верхнякрывінскі сельскі Савет |
| 14. | **Курганны могільнік перыяду ранняга сярэднявечча X-XII ст.ст.**  Знаходзіцца ў 150 м. ад паўночнай ускраіны вёскі, на левым беразе р. Свячанка, ля месца яе вытока з воз. Стрыжэўскае. 2 курганы вышынёй каля 1,7 м., дыяметрам 11-12 м. Выявіў у 1955-56 гг. Л.В. Аляксееў, абследавалі ў 1967 г. Г.В. Штыхаў, у 1972 г. М.М. Чарняўскі. Раскопкі не праводзіліся.  | **3** | в. Давыдкавічы Бешанковіцкі сельскі Савет |
| 15 | Курганны могільнік (5 насыпаў) | **3** | в. Жарна-секава |
| 16 | Курганны могільнік-1 (2 насыпы) | **3** | аг. Бачэйка-ва |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 17 | Курганны могільнік-2 (2 насыпы) | **3** | аг. Бачэйка-ва |
| 18 | Гарадзішча жалезнага веку | **3** | в. Чарна-госце |
| 19 | Гарадзішча Бортнікі-1 | **3** | в. Бортнікі-1-я |
| 20 | Курганны могільнік | **3** | в. Жданова |
| 21 | Курганны могільнік (5 насыпаў) | **3** | в. Фролка-вічы |
| 22 | Курганны могільнік | **3** | в. Крупе-ніна |
| 23 | Курганны могільнік перыяду ранняга сярэднявечча | **3** | в. Зарэчча |
| 24 | Гарадзішча | **3** | в. Зама-шэнне |
| 25 | Курганны могільнік | **3** | в. Зама-шэнне |